# БАЦЬКОЎСКІ ДОМ

Бацькоўскі дом… Свет пад крылом матулі
Любові, ласкі, дабрыні, цяпла…
Бацькоўскі дом… Заўсёды там прытуляць
І захінуць ад гора і ад зла.

Я рэдка ў роднае лячу мястэчка,
Нячаста бачу я сваіх бацькоў.
Турботы, быт, а сэрца аж трапеча
І на душы самотны неспакой.

Як хочацца парой абняць матулю,
Прыціснуцца да бацькавай рукі,
Сказаць ім: «Божа, як жа вас люблю я!»
Змахнуць слязінку ціха са шчакі.

Бацькі мае, за ўсё я вам удзячна
І не стамлюся «дзякуй!» гаварыць
За тое, што жыццё мне падарылі
І навучылі ўсіх вакол любіць.

Шануйце, людзі, змалку беражыце
Сваіх любімых, дарагіх бацькоў!
Любоў, цяпло і ласку ім дарыце
І едзьце ў дом бацькоўскі зноў і зноў!

Аўтар Аксана Чарнавок